nieważ przechowalnia znajdowała się dość daleko, na dole, zrezygnowałem, a nieszczęsny nożyk wyrzuciłem do kosza. Już chciałem iść, ale okazało się, że jeszcze muszę pokazać klucze, które mam przy sobie. Po tych kontrolach nareszcie mogłem usłyszeć: „dziękuję" i ruszyłem dalej. Sprawdzono jeszcze bilety i paszport. Podróż do Warszawy trwała godzinę, w czasie której zdążono podać wszystkim pasażerom jakiś pakuneczek ze smakołykami.

Na warszawskim Okęciu czasu przed odlotem do Mińska miałem jeszcze dość dużo. Mimo to przy odprawie musiałem stać w tłumie pasażerów z ogromnymi bagażami. Wśród oczekujących dostrzegłem młodego księdza. Ucieszyłem się, bo myślałem, że dowiem się od niego czegoś o Kościele na Białorusi. Miałem przecież w Mińsku od razu po przylocie zajrzeć do „czerwonego kościoła". Zagadnąłem więc go, ale okazało się, że ksiądz nie rozumie po polsku, bo jest z Austrii. Rozmawialiśmy więc po niemiecku. Niczego się jednak ciekawego nie dowiedziałem, bo mój ksiądz owszem, do Mińska jechał, ale do całkiem innego kościoła.

Po odprawie wsiedliśmy do autobusów, które powiozły nas po płycie lotniska w stronę samolotu. Była to maszyna białoruskiego przewoźnika BELAWJI. Niedługo po starcie podano wszystkim pasażerom posiłek. Cztery godziny lotu, które – zgodnie z rozkładem – spędziliśmy na pokładzie samolotu, przeszły bardzo szybko.

Z lotniska do Mińska: 50 km

Szczęśliwie wylądowaliśmy w Mińsku. Tu, podobnie jak na lotnisku w Warszawie, tłumy ludzi. Udało mi się w tym kłębowisku dojrzeć niedaleko oczekujące na klientów taksówki. Poszedłem najpierw do kantoru, wymieniłem 50 zł na około 24 tys. rubli i wsiadłem do taksówki. Myślałem, że do „czerwonego kościoła" w centrum miasta będzie – ot, kilka tam ulic. Myliłem się. Gdy wyjechaliśmy na autostradę, dowiedziałem się od taksówkarza, że do Mińska jest 50 km, że *aerodrom* znajduje się w Smolewiczach, o tyle właśnie oddalonych od stolicy. Taksówkarz powiedział mi, że moja przejażdżka będzie kosztować 50 tys. rubli. Ponieważ miałem jedynie połowę tej kwoty, uprosiłem kierowcę i dopłaciłem mu drugą część w złotówkach (dałem mu oprócz wszystkich rubli 50 zł). Koniec końców dojechałem nareszcie do miejsca przeznaczenia. Ponieważ była to sobota, zaczęli się schodzić ludzie na mszę. Msza odprawiana była w języku białoruskim. Gdy się skończyła, poszedłem do zakrystii. Chciałem się dowiedzieć, czy w Mirze jest plebania i ksiądz mieszka na stałe, czy – jak dawniej – dojeżdża z Karelicz. Ksiądz nie potrafił odpowiedzieć na moje pytanie i wyjaśnił, że Mir leży w grodzieńskiej diecezji. Dostałem jednak na kartce numer telefonu do księdza w Kareliczach. Poczułem się pewniejszy, a telefon do Karelicz, jak się potem okazało, uratował całe moje przedsięwzięcie. Pełen optymizmu wyszedłem od księży. Pojawił się jednak nowy problem – nadchodziła noc i musiałem szybko szukać jakiego noclegu.

Hotel Sputnik -- z lokatorem

Zacząłem dopytywać się o hotel, ale nie wszyscy rozumieli, co to słowo znaczy. Musiałem przejść na *haścinicu*. Wskazano mi jednak bardzo drogi hotel – doba kosztowała w nim 100 dolarów. Było to oczywiście za drogo jak dla mnie. Portier stojący przy drzwiach wejściowych doradził mi, żebym przejechał dwa przystanki i zaszedł do hotelu „Sputnik", który na pewno będzie tańszy. Tak też uczyniłem, tyle że „Sputnik" wcale nie okazał się taki tani. Najpierw pani naliczyła mi 27 tys. rubli, zaraz się jednak poprawiła i cena wzrosła do 31 tys. za pokój dwuosobowy, w którym już ktoś mieszka. Wygód to w tym hotelu nie było mi dane doświadczyć. W pokoju był jeden stolik i jedno krzesło, a toaleta w korytarzu. Mego współlokatora nie było. Minęła 21 – nie ma go nadal, 23 – nie przychodzi. W końcu przyszła jakaś kobieta z obsługi hotelowej i zabrała jego rzeczy, bo okazało się, że klient nie zapłacił za kolejną dobę. Poszedłem więc spać. Po dwóch godzinach – było gdzieś około pierwszej w nocy – usłyszałem mocne pukanie. Otworzyłem i zobaczyłem tę sama kobietę z obsługi i jakiegoś młodego chłopaka. Nocny gość wszedł niczym nie skrępowany. W ręku trzymał niedopite jeszcze piwo; nawet mnie zachęcał, żebym się poczęstował (odmówiłem). Mój niespodziewany współlokator rozebrał się, otworzył okno i zapalił papierosa. Dodał grzecznie, że chyba mi to nie przeszkadza, po czym w końcu zgasił światło i położył się spać. Od razu zaczął chrapać. I tak aż do rana. A ja nie zmrużyłem oka.

Wstałem o siódmej rano. Przypomniałem sobie, że jest niedziela, a więc obowiązkowo trzeba było pójść na mszę. Umyłem się pod kranem w toalecie w korytarzu i poszedłem na przystanek autobusowy. Tu przekonałem się, że tutejsza młodzież zupełnie nie zna języka polskiego, a zagadnięte osoby nie wiedziały nawet, co znaczy słowo TAXI. Gdy pokonałem nareszcie dwa przystanki dzielące mnie od „czerwonego kościoła", msza w kościele zdążyła dopiero co się rozpocząć. Odprawiana była po polsku. Ludzie w kościele byli ładnie, odświętnie ubrani, a kobiety, których była większość, stały w chustkach na głowach.

Elektryczką do granicy wspomnień

Po kościele ruszyłem w stronę *wakzału*. Droga okazała się niezbyt daleka i w dziesięć minut byłem na miejscu. Przy dworcu otwartych było bardzo dużo rozmaitych sklepików i kiosków. Znalazłem spożywczy i podszedłem

kupić coś do jedzenia. Wziąłem pepsi – w podobnej butelce jak u nas, bułkę (poprosiłem, żeby mi ją pani pokroiła, bo jak wiadomo noża ze sobą nie miałem) i paróweczkę – też podobną do naszych. Ekspedientka wzięła i położyła mi to wszystko na jakiejś kartce. Popatrzyłem zdziwiony i poprosiłem, żeby mi to zapakowała do foliowej torebki. I tu niespodzianka – torebka kosztuje 25 rubli. Niby grosze – bo przekonałem się potem, że kwotę do 50 rubli traktują tu jak u nas grosze – ale jednak. U nas przecież nikt nie zwraca uwagi na foliowe torebki i używa się ich bardzo powszechnie. W jednym ze sklepików stały dwa stoliki, skorzystałem więc z okazji i usiadłem, żeby normalnie zjeść to moje śniadanie. Gdy skończyłem, poszedłem do kas i kupiłem bilet na *elektryczkę* (najzwyklejszy pociąg osobowy) do Baranowicz. Ponieważ pociąg odjeżdżał dopiero o godzinie 11.44, miałem sporo czasu, żeby popatrzeć na przewalające się tu tłumy. Nie różniły się od tych z Dworca Centralnego w Warszawie. Nawet schody ruchome były podobne. Dworzec w Mińsku zmienił się od czasu, gdy widziałem go ostatnio przed sześciu laty. Przebudowano go, pojawiło się więcej okienek, no i ruchome schody.

Pociąg zwany *elektryczką* jest tak zbudowany, że pasażerowie widzą się nawzajem w całym wagonie. Najbardziej podobały mi się zapowiedzi stacji, na których się zatrzymywaliśmy i informacje o *śledujuszczych* (następnych) przystankach. Przypominały mi się wtedy nazwy stacji, które zapamiętałem sprzed wojny – Kołosowo, Niegorełoje... A gdy usłyszałem, że *śledujuszcza* to Stałpcy, oznaczało to, że zbliżamy się do granicy II Rzeczypospolitej. No, to jestem u siebie – pomyślałem.

W Stołpcach trzeba było przejść po bardzo wysokim wiadukcie, co nie było dla mnie takie łatwe, zważywszy że chodzę z laseczką. Uspokajało mnie jedynie to, że nie musiałem się spieszyć – od 12.30 do 16.45 miałem wolny czas. Zacząłem więc rozglądać się po okolicy. Niewiele się tu zmieniło od mojej ostatniej wizyty 15 lat temu. Przybyło jedynie kilka sklepików; do jednego z nich zaszedłem i uzupełniłem swoje skromne śniadanie (znów pepsi i coś niby pączek). Na dworcu autobusowym zajęte były wszystkie ławki ustawione w długie rzędy. Znalazłem jakoś wolne miejsce i czekałem z całą resztą podróżnych. Pogoda w niedzielne popołudnie 17 sierpnia 2003 r. dopisywała.

W końcu podstawiono autobus do Biereżnoje – tak samo jak niegdyś, z tą tylko różnicą, że dzisiaj wszyscy spokojnie wsiadali, a nie jak poprzednio na hurra. Od tego momentu zaczęło mi się wszystko dziwnie pomyślnie układać. Wysiadłem w Słobódce, miejscowości sąsiadującej z moją rodzinną wsią. Ludzie radzili mi, żebym do Kościuków szedł przez wieś, choć przez pola było zdecydowanie bliżej. I tak uczyniłem. We wsi bardzo wielu ludzi siedziało akurat na ławeczkach – słońce przyjemnie grzało. Wielu zapraszało mnie do siebie na odpoczynek i pogawędkę. Przysiadłem się więc chyba ze trzy razy. Ludzie byli ciekawi, skąd wziął się tu taki człowiek z plecakiem. Okazało się też, że mieliśmy wspólnych znajomych.

Przy końcu wsi stały dwa samochody. Jeden z nich minąłem, przy drugim zatrzymałem się i zapytałem, czy nie jedzie przypadkiem do Kościuków. A do kogo? – zapytano mnie. – Do pani Wandy Barancewicz – odpowiedziałem. Kierowca uśmiechnął się i kazał wsiadać. Okazało się, że to znajomy pani Wandy, a potem wyjaśniło się, że to nawet krewniak – brat jej zięcia. Zajechaliśmy więc samochodem na podwórko. Gospodarze wybiegli, ciekawi, kto też zajechał. Było oczywiście przywitanie, kazano mi zdjąć plecak i usiedliśmy do herbatki, bo było już po obiedzie.

Gdy odpocząłem, zdążyłem jeszcze tego samego dnia pójść na cmentarz i zobaczyć pomniczki, które postawiłem na grobach najbliższych15 lat temu. *Cdn*

Fot. Autor ■

Сакрат Яновіч

Было – як учора

8. Двухтысячны першы год у мяне – гэта радасць і бяда, удачы і хваробы (лекары і шпіталь). Не высоўваў носа па-за Згуртаванне Віла Сакрата. Пры праблемах з сэрцам усё можа здарыцца і не будзе каму пераняць маладую справу з выхадам беларускага ў Еўропу. Раблюся іпахондрыкам, заслуханым у нутро свайго цела. Яно ў мяне цяпер адзінагалоўны інструмент, на якім трымаецца ўсё дасягнутае. Запыніцца „помпка" ў грудзях і будзе канец зробленаму. Або, не дапусці Божа, рак пакоціць! Такія эмоцыі, вядома, выклікаюць усмешку, пакуль усё ў цябе добра. Пашчасціла з непалахлівым кардыёлагам, які, аднойчы, моцна засаромеў мяне: – Czemu pan nie mówi do mnie po białorusku? Я тож беларус, – азваўся ён з міхалоўска-гарадоцкім акцэнтам, калі я кончыў апранацца да выхаду.

Ляжанне ў саколкаўскім шпіталі стамляла празмернай лекарскай апекай, бо сярод медыкаў выявілася пару чытачоў маіх кніжак; яны дрыжэлі над маім здароўем. Думаю: ахвотна пазбыліся б такога пацыента ў іншую лекарню, дзе не ведалі б хто я. З гэтым было так, як з апякунскай маткай, што сваёй дабрынёю тэрарызуе дзіця...

Марозная зіма прамінула на лекаванні ды рассылцы другога вы-

Фота са збораў Аўтара

Крынкаўскія гімназісты ў доме Яновіча.

пуску „Году Беларускага”. Усякія ўколы штодзень прыдавалі заядласці, блізкай адчаю або і мазахізму. Падбухторвалі пісьмы і тэлефоны ад чытачоў „Году” на Захадзе. Юрка Хмялеўскі ў ролі па-інжынерску кваліфікаванага тэхнічнага рэдактара ўсведамляў мяне, як мала трэба ва ўмовах новых тэхналогій друку (дыскеты!), каб прыстойна аформіць том з акуратна напісаных аўтарамі тэкстаў (на якіх хочаш мовах). Я, выхаваны ў эпоху лінатыпаў, не мог надзівіцца, што аніхто, скажам, у Менску не дадумаўся да гэткае ініцыятывы. Неацэнны Юрка сказаў: – Бачыш, Сакрат, там жывуць саветы, а іх ужо адвучылі ад самастойнасці. Прычым, трэба быць творча шалёным ды хацець рабіць нешта бясплатна, нават не за „дзякуй”.

Старажытная беларуская мудрасць кажа: калі бяда, дык аднае будзе мала. У пачатак дваццаць першага стагоддзя аж надта пераканаўся ў ейнай цэльнасці. Даволі было змясціць у „Часопісе” пару крытычных словаў у адрас арганізатараў кангрэсу беларусістаў, на які ў снежні з’ездзіў я ў Мінск, каб зараз жа абрынулася на мяне цёмная бура лаянак у выглядзе „адкрытага пісьма”, разасланага ва ўсемагчымыя рэдакцыі; дэмакратычна апублікавалі яны як голас чытачоў. Уключна з пагражаннем у ім судовай расправай, хто ведае ці не ў міжнародным страсбургскім... Не верачы сваім вачам чытаў тыя тэксты. У шокавым адранцвенні. Бог падказаў устрымацца ад палемікі, своечасова сцяміўшы, што стаяць за скандаламі ці не персоны, якім хочацца закінуць агонь у беларускую хату. На неразумную злосць трэба адказваць маўчаннем, бо ў супраціўным выпадку запыліць клубаваннем бойкі, у якой, замест рацыяў, загарыцца баксёрская барацьба „хто – каго?!”

Як быццам па законе КАЛІ БЯДА... пасыпаліся лісты з Рэспублікі Беларусь не да мяне а ў Варшаву з пратэстамі супроць мае публікацыі ў „Выбарчай газеце” аб тым, між іншага, што беларускі нацыянальны адраджэнскі рух сапхнуты саветамі ўжо ў грамадскую маргінальнасць, у сітуацыю яго непрымальнасці насельніцтвам, у сектанцкае існаванне; беларуская дзяржава ўпарта ліквідуе беларускую мову. Sic!

Трэцюю атаку павялі т.зв. свае людзі з Беластока, пакарыстаўшыся трыбунаю газеты „Советская Белоруссия”.

З пункту гледжання журналіста – я павінен быць рады такім гвалтам. У азарце наважыўся ўгнявіць і Варшаўку, у адрас якой, таксама, нямала прыкрага напісаў – за балаганна праведзены ёю Кангрэс польскай культуры (дзе выступіў з асобным дакладам пра будучыню правінцыі ды ўпадак цэнтру). Мая з’едлівасць мела часткова асабісты падтэкст. З абодвух кангрэсаў, беларускага і польскага, адзін за адным, вярнуўся я тады дахаты з неадольным запаленнем лёгкіх, бальнічным, і з пачуццём нечага накшалт акварнасці: культура не цікавіць уладаў Беларусі, ані Польшчы, як ні сумна.

Махнуў рукою на ўсё тое імпрэзнае і на ўсіх тых „нацыянальна заклапочаных”. Шкада энергіі на нерэальныя дзеянні. Хоць варшавякі паказалі арыстакратычна клас, не топчучы мяне ў балота (слушна ці няслушна). Затое народжаныя ў сялянскіх галодных сем’ях сталічныя мінчукі ўскіпелі вясковакалхозным мардабоем. Вельмі народным, дарэчы кажучы. Цвёрда тады даў я сабе зарок ашчаджацца дзеля праўдзіва важнага толькі, не спапяляцца ў дыскусіях з тытульнымі мужыкамі і з socjalistycznymi панамі. Я ж не маладзенькі, ужо няма часу на такія гульні. Зрэшты, на матэматычны розум, мае апаненты калісьці даведаюцца, аднак жа, што Зямля сапраўды круціцца, і – напрыклад – два цераз два напраўду раўняецца чатыры, а не пяць або чатыры з паловаю... Можа і не яны, але іх дзеці або ўнукі. У беларускай дзейнасці, на жаль, нямала фанатычнага бальшавізму, гэта значыць: віртуальнасці, а не рэальнасці!

Пайшлі-паехалі потым перапрашацца перада мною, што каштавала, таксама нямала, майго моцнага высілку, каб – крый Божа! – зноў не паверыць слёзнай лірыцы. Я спачуваю ім – ведаюць гісторыю, але не разумеюць яе, а ў палітыцы могуць быць яны не больш чым

фраерамі. З такое няспеласці не выходзіцца за адно жыццё, таму надзея ў наступным, несялянскім, пакаленні. У гарадскім, якім цалкам яшчэ не будуць нашы дзеці; псіхічна адвясковяцца ўнукі, прайшоўшы салідныя універсітэты (без прафесуры *краснознамённой*). Тупасць, невуцтва саветаў нязменна здзіўляе! У іх жа паўсюдным быў культ навукі! І вось бачым мінскіх дацэнтаў з інтэлектам польскіх „матурыстаў" і афіцэраў з узроўнем польскіх сержантаў. Некалі Пушкіна папярэджваў нехта з расійскіх князёў, каб ён асцярожна сябраваў з Адамам Міцкевічам: інтэлектуальна лёгка заткне „русского гения" за пояс. І сапраўды, немагчыма ўявіць сабе Александра Сергеевича ў ролі універсітэцкага выкладчыка, якім стаўся ў Францыі той жа літвін.

Рэчаіснасць ходзіць кругамі. Прыемная і нечаканая мода ў настаўнікаў прыводзіць-прывозіць у мой дом вучняў з Крынак, з Гарадка. Дзятва і падшпаркі размаўляюць між сабою натуральна па-польску, як савецяняты па-руску. Прыкра! Ствараю настрой элітнасці беларушчыны як умовы выйсця прастаты ў элегантнасць. Вар'яцкая канцэпцыя! Перадмоладзь не зайздруе мне, вытрэшчваецца ў мой бок, бы на унікальнага звера ў заапарку. Мужыцкае выхаванне зводзіцца да нешанавання роднага парога і *ciągłego prężenia się do skoku w bogate kraje,* бы варвары ў Рым. Раскусіў я і школьных выхавацеляў, тых функцыянераў асветы, у якіх ні кропелькі натхнёнай місійнасці; гавораць па-беларуску з такім дзікім акцэнтам, як быццам першы раз ад нараджэння. Адразу верыцца плёткам, што прадмет беларускай мовы яны навучаюць на... польскай мове. Ды чаму гэтае пілігрымства да мяне? Прычына цваная: выручаюцца мною. А я, баран, думаў, што ўспамагаю іхны нацыянальны патрыятызм! Не нацыя яны, а чалавечыя адзінкі, злосныя, чаму не жывуць у Варшаве. А саветкі *мечтают о Москве*!

Фота Міры Лукшы

Семінар „Белавежы" ў Беларускім ліцэі (злева направа: Ян Чыквін, Сакрат Яновіч, Васіль Петручук, Юрка Баена, Жэня Мартынюк; усіх удзельнікаў 11).

Веснавы семінар літаратурнае „Белавежы" ў бельскім ліцэі з дадатковым прадметам беларускай мовы. Сенсацыйна прагучаў даклад Алеся Пашкевіча з Мінска – пра эміграцыйную літаратуру. Пасля, старшыня Аб'яднання Ян Чыквін выдасьць яму кніжку, за якую ўчэпяцца запененыя постсавецкія ўсёзнайкі. Я баяўся, што Алесь пачне адбрэхвацца заслінёным дварнякам, але – на шчасце! – Бог не пашкадаваў розуму маладому, добра адукаванаму, пісьменніку. Бяда беларускай літаратуры ў мінулым была ў тым, што ў яе асяроддзі, – акрамя сышчыцтва, – катастрафічна не хапала аўтараў з вышэйшай адукацыяй; дамінавалі самавукі без акуратнай прафесійнай падрыхтоўкі, пішучыя на фальклорным узроўні. Дзевятнаццатае стагоддзе ў Беларусі працягнулася да паловы дваццатага або і крыху далей.

Той памятны семінар у Бельску вызначыўся і тым, што мела месца павальная, бураломная дыспутка ў публічнай бібліятэцы. Чытачоў сышлося зусім **не** навалам, затое палеміка з імі адбывалася на нажы! Я дрэнна пераношу дрымоту гладкіх прамоваў, яшчэ горай палітычна правільных, бо ў значнай ступені ашуканскіх, хітрэцкіх. Вось пытанне да мяне: – Што трэба зрабіць, г.зн. я, каб у Беларускім ліцэі ажыў беларускі дух і беларуская мова? – І мой адказ: – Адзінае, што магчыма ў такім занядбанні нацыі зрабіць, гэта **ліквідаваць** Беларускі ліцэй, а яго вучняў разаслаць па шчыра-польскіх (ліцэях), хай там сабе салодка палякуюць яны без стрымання!.. Мне ўжо сардэчна абрыдла прыпісная роля збаўцы беларусінства, а папраўдзе „казла адпушчэння". Не хочаце быць беларусамі, то не будзьце! *I dajcie mi święty spokój!* Я адзін маю змагацца за ўсю нацыю!? А дзе вы, кожны з вас?!!

Увыклі спадзявацца на кагосьці, замест на саміх сябе.

(Працяг будзе)



Календарыюм

Кастрычнік – гадоў таму

740 – Першыя пісаны зьвесткі (1263 г.) пра вядомы Ляшчынскі манастыр, які разьмяшчаўся ў Лешчы (прадмесьці Пінска).

480 – У 1523 г. была надрукавана ў Кракаве славутая паэма „Песьня пра зубра" аўтарства выдатнага беларускага паэта, выпускніка вучэльняў Рэчы Паспалітай і Італіі Міколы Гусоўскага.

270 – 20.10.1733 г. у Пінску нар. Адам Станіслаў Нарушэвіч. Закончыў Пінскі калегіюм (1748), вучыўся за мяжой. Выкладаў паэтыку і рыторыку ў Віленскай акадэміі. З 1788 г. быў біскупам смаленскім, з 1799 – луцкім. Цікавіўся гісторыяй Польшчы, Літвы і Беларусі. Памёр 8.07.1796 г.

235 – 30.10.1768 г. у Жніне нар. Енджэй Снядэцкі, хімік, лекар, філёзаф і асьветнік. Больш за 40 гадоў жыў і працаваў у Вільні: у 1797-1822 гг. прафэсарам хіміі, 1826-1832 – мэдыцыны ў Віленскім унівэрсытэце, з 1832 г. – прафэсарам Мэдыка-хірургічнай акадэміі. Памёр 11.05.1838 г.

220 – 10.10.1783 г. памёр Людвік Грынцэвіч, архітэктар, прадстаўнік позняга барока. Праектаваў касьцёл аўгусцінцаў у Валынцы каля Верхнедзьвінска, касьцёл дамініканцаў у Друі, дамініканскі кляштар у Нясьвіжы.

220 – У 1783 г. быў пабудаваны касьцёл бернардзінцаў у Будславе каля Мядзела.

215 – 7.10.1788 г. у в. Гразівец каля Чавусаў нар. Іван Насовіч, беларускі мовазнавец і этнограф. Закончыў Магілёўскую духоўную сэмінарыю (1812), у 1813-1843 гг. працаваў у Аршанскім і Мсьціслаўскім духоўных вучылішчах, Маладзечанскім і Сьвянцянскім дваранскіх вучылішчах. Асноўнай яго працай лічыцца „Слоўнік беларускай мовы" (1870), у якім сабрана больш за 30 тыс. слоў. Забіраў таксама беларускія прыказкі і прымаўкі, загадкі, песьні. Памёр 6.08.1877 г.

180 – 23.10.1823 г. у Замосьці Слуцкага пав. нар. Адам Плуг (сапраўднае Антоні Пяткевіч), пісьменьнік і журналіст. З 1831 г. жыў з бацькамі ў Жукавым Барку над Нёманам, у 1835-1842 гг. вучыўся ў Слуцкай гімназіі. Сябраваў з Уладыславам Сыракомляй, які тады жыў у Залучы. Працаваў настаўнікам на Падольлі. У 1874 г. пераехаў у Варшаву, дзе працаваў рэдактарам у часопісе „Kłosy", дзе друкаваў шмат матэрыялаў пра Беларусь. Пазьней працаваў у рэдакцыях „Wielkiej Powszechnej Encyklopedii Ilustrowanej", часопіса „Wędrowiec", газэты „Kurier Warszawski". Памёр 2.11.1903 г. У беларускую літаратуру ўпісаліся яго апавяданьні на беларускай мове.

175 – 2.10.1828 г. у Кузьніцы Беластоцкай нар. Міхал Каяловіч, гісторык і публіцыст. У 1855 г. закончыў Пецярбургскую духоўную акадэмію, дзе пасьля працаваў выкладчыкам. Напісаў м.інш. „Лекции по истории Западной России" (1864). Памёр 4.09.1891 г.

170 – 15.10.1833 г. у Флярэнцыі пам. Міхал Клеафас Агінскі (нар. 25.09.1765 г. у Гузаве пад Варшавай), дзяржаўны дзеяч, кампазітар, аўтар слыннага палянэза „Развітаньне з радзімай".

155 – 3.10.1848 г. у Шэрашэве Пружанскага пав. ад халеры памёр Міхал Баброўскі (нар. 19.11.1784 г. у Вульцы Бельскага пав.), слявіст і арыенталіст. Закончыў Беластоцкую гімназію (1806) і Галоўную духоўную сэмінарыю пры Віленскім унівэрсытэце (1812). У 1822-1924 гг. і 1826-1833 гг. быў прафэсарам Віленскага унівэрсытэта. З 1833 г. у Шэрашэве атрымаў прыход.

145 – 25.10.1858 г. у в. Пятровічы каля Смалявіч нар. Эдвард Пякарскі, этнограф, географ, фальклярыст. Вучыўся ў Мінскай, Мазырскай, Чарнігаўскай гімназіях, у Харкаўскім вэтэрынарным інстытуце. За ўдзел у народніцкім руху выключаны з інстытуту і сасланы ў Якуцію (1881), дзе дасьледаваў геаграфію, фальклёр, мову; дзейнічаў ва Усходне-Сібірскім аддзяленьні Рускага Геаграфічнага Таварыства. Памёр 29.06.1934 г.

140 – 13.10.1863 г. у Віцебску нар. Леў Шапялевіч, гісторык літаратуры і археоляг. У 1882 г. закончыў Віцебскую гімназію, у 1892 г. Хар-

каўскі і Новарасійскі унівэрсытэты. Выкладаў сусьветную літаратуру ў Харкаўскім унівэрсытэце. Дасьледаваў заходняэўрапейскую літаратуру. З 1900 г. праводзіў археалягічныя раскопкі на Віцебшчыне. Памёр 10.02.1909 г.

125 – 15.10.1878 г. памёр Ігнацы Касовіч (нар. у 1808 г. на Віцебшчыне), філёляг. Закончыў Галоўную духоўную сэмінарыю Віленскага унівэрсытэта. З 1833 г. прафэсар грэцкай мовы і царкоўнага красамоўства ў грэка-каталіцкай сэмінарыі ў Жыровічах. З 1835 г. выкладаў у Кромскай, Смаленскай, Маскоўскай гімназіях. З 1870 г. працаваў прафэсарам грэцкай мовы ў Варшаўскім унівэрсытэце. Разам з братам Каятанам склаў „Грэчэска-рускі слоўнік" (1847).

125 – 21.10.1878 г. нарадзіўся выдатны беларускі гісторык Уладзімір Пічэта (1878-1947). Быў ён першым рэктарам Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсітэту. У 1929 г. як адзін з першых беларускіх вучоных стаў ахвярай савецкага тэрору.

120 – 30.10.1883 г. у Лакцянах Сьвянцянскага пав. нар. Ян Семашкевіч, беларускі ксёндз і паэт (Янка Быліна). З 1933 г. служыў на Беласточчыне – у Янаве (1933-1937), Ялоўцы (1937-1939), Міхалове (1939-1946), Бомблі (1946-1956). Быў аўтарам паэтычных

Калісь пісалі

Nia ŭsio i tut dobra

Z pad Sakołki. U nas tut u hetym hodzie letam zdaryłasia kolki wypadkaŭ zabojstwa: tam jedučy z Sakołki z tarhu na darozie kampanija zawiałasia čahości bicca i adzin musiŭ nałažyć hałoŭkaju; tam u wioscy susiedzi zabili susieda; tam u samaj Sakołcy, muž swaju žonku; tam dziaŭčyna pajšła ŭ les pa jahady i potym znajšli tolki trupa. Ja na ŭłasnyja wočy hetaha nia bačyŭ i nia wiedaju, jak što tam było, ale tak ludzi haworać.

Kali ŭ hetym samym časie ŭ Wilni ŭ himnazii im. Lelewela adny adnych pastralali, to ab hetym pisali ŭsie hazety. Tak! Bo zabiwać adny adnych – heta ŭžo paśledniaja rabota!

Tak sama i ŭ nas tut, čaławiek zhinuŭ i to nie adzin, čaławiek zhinuŭ i nie piarun jaho zabiŭ, nie aŭta jaho razjechała, nia dziki źwier jaho razdzior, ale čaławiek u spakojnym časie, biez wajny, zhinuŭ z ruki druhoha čaławieka.

U nas tut naahuł ludzi spakojnyja, hetaha ŭ nas daŭniej i čuwać nia było, ale ciapier woś, stałasia!

Kab ratawacca ad hetaha niaščaścia, ad hetaje plahi, treba bolšaje relihijnaje świedamaści; čaławiek relihijny hetaha nikoli nie zrabiŭ-by. Treba raspačać akcyju ŭświedamleńnia relihijnaha tak, kab jana siahała dalej za mury našych światyniaŭ; bo ŭ kaściele ksiondz choć haławoju ab mur bisia, ŭsio roŭna taki nieświadomy chryścijanin nie pačuje, a nie pačuje praz toje, što jon nia ličyć sabie za abawiazak bywać u niadzielu i świata ŭ kaściele na nabaženstwie i wysłuchać nawuki, a kali i pryjdzie, dyk nie zrazumieje ničoha, bo jana haworycca pa polsku.

Jašče treba ŭ nas tut i kulturna-aświetnaje pracy, stasoŭna da wyšejskazanaha, tak i naahuł. Bo jość na świecie mnoha ŭsiaho takoha, što pa druhich krajoch ludzi znajuć i karystajuć, a ŭ nas ab hetym i nia čuli. Prabujuć u nas tut pracawać u hetym kirunku. Ale što-ž! Kali, nia hledziačy na toje, što tutejšaja ludnaść, heta ludnaść biełaruskaja, haworać da jaje, jak da palakoŭ. Nie, hetak nia možna! Praz heta nia tolki, što praca sama pa sabie nia moža dać pažadanych skutkaŭ, ale heta hwałt nad samoju pryrodaju, narušeńnie jaje prawoŭ adwiečnych. Kab praca padniataja na pažytak narodu dała pažadanyja wyniki, treba kab jana była abapiorta na hruncie hetaha-ž narodu; jak u nas tut i ahułam na Biełarusi treba padać narodu, jak zdabytak kultury, tak i istotu Relihii ŭ formie rodnaj biełaruskaj.

Haworačy, što ludnaść tutejšaja heta ludnaść biełaruskaja, nie chaču skazać, što tut niama saŭsim palakoŭ; jość i palaki, ale niewialički pracent.

Tutejšyja biełarusy mohuć časam padawać siabie za palakoŭ, ale heta pa swajoj niaświedamaści, nia wiedajučy chto jany takija, ci nia mohučy znajści roznicy pamiž narodnaściaj i relihijaj. A treba wiedać, što tut kruhom Sakołki, a tak-sama i ŭ samaj Sakołcy biełarusy pa relihii – kataliki.

Da taho jašče našy biełarusy, asabliwa maładziaž, dzieści ŭ ludziach, a tym bolš kali widzić pierad saboj intelihienta, starajecca hawaryć pa polsku. Takaja ŭžo moda i niama što dziwicca, bo jak pisaŭ naš Buračok „i pany achwatniej haworać pa francusku, jak pa swojmu".

Toje, što hawaryłasia wyšej, datyč prostaha narodu, a intelihienty, što wyjšli z našaha biełaruskaha narodu, z małym wyniatkam, tak sama ličać siabie palakami, ale tut užo zachodzić tolki pryčyna taja, dla jakoje praz doŭhi čas adchodzili jany – adny da palakoŭ, druhija da rasiejcaŭ.

Uradžai ŭ nas tut sioleta jašče niazhoršyja, wielmi dobraje było žyta pa łubinie, a awios na seradeli; jašče nia kiepski byŭ awios dzie na pahnojach i na zimowaj ralli, za toje na prastapoli i jak da taho jašče na zimu nia było ŭzorana – awios błahi.

Heta niachaj našyja haspadary prymuć pad uwahu; a što da łubinu, niachaj heta majuć na pamiaci i na wiasnu pryčakaŭšy, zasiawajuć im pawodle mahčymaści ŭwieś papar, a asabliwa na piaskoch, na horach, tam, dzie žyta najhorš nia choča raści.

D. Aniśko. „Biełaruskaja Krynica", nr 2, 4.10.1925 h., s. 5

зборнікаў „На прызьбе” (Вільня 1918, 1926), „На покуці” (Вільня 1934), рэлігійных твораў „Ружанец да Найсьвяцейшае Дзевы Марыі” (Вільня 1928), „Песьні жальбы або набожныя разважаньні аб муках і сьмерці Збаўцы Езуса Хрыста” (Вільня 1929), „Дарога крыжа” (1930). Памёр 18.02.1956 г. у Бомблі, дзе і пахаваны побач касьцёла. На ягонай бацькаўшчыне ў Лакцянах 9–10.08.2003 г. Грамадзкае Аб’яднаньне „Вільняр” ладзіла мастацкі пленэр і краязнаўча-літаратурныя чытаньні.

115 – 1.10.1888 г. у Слоніме нар. Лукаш Дзекуць-Малей, беларускі настаўнік і баптысцкі дзеяч. Быў адным са стваральнікаў Беларускай Народнай Рэспублікі і яе прадстаўніком на Гродзеншчыне. У 1918 г. заснаваў беларускую школу ў Крынках. У міжваенны перыяд быў баптысцкім прэсьвітарам у Брэсцкай акрузе. Пераклаў „Новы запавет” і псальмы на беларускую мову, якія былі выдадзены ў 1931 г. Рэдагаваў „Беларускую балонку” ў баптысцкім часопісе „Маяк”. Арыштаваны 19.06.1941 г. у Брэсьце савецкімі органамі бясьпекі і прыгавораны да расстрэлу. Пасьля ўваходу у Брэст Немцаў, служыў у баптысцкай царкве, у чэрвені 1944 г. удзельнічаў у II Усебеларускім кангрэсе ў Менску. У 1945 г. быў у Нямеччыне, з 1946 г. у Польшчы – на Беласточчыне і ў Гданьску, дзе быў акруговым прэсьвітэрам баптысцкай царквы. Памёр у Гданьску 20.01.1955 г.

115 – 13.10.1888 г. у засьценку Пункі каля Глыбокага нар. Язэп Драздовіч, беларускі мастак. У 1906-1910 гг. вучыўся ў Віленскай мастацкай школе. Шмат маляваў і рысаваў у міжваенны перыд. Памёр у 1954 г. У Беларускім Грамадзка-Культурным Таварыстве ў Беластоку захоўваюцца ягоныя 4 працы на палатне сцэнарнага характару. У 2002 г. у Менску выдадзены яго манаграфічны альбом.

110 – 18.10.1893 у Каўнасе нар. Уладзімір Уладамірскі (сапраўднае Малейка), акцёр. Сцэнічную дзейнасьць пачынаў у 1920 г. у Бабруйску. У 1924-1959 гг. іграў у тэатры імя Янкі Купалы ў Менску. Памёр 24.01.1971 г.

95 – 6.10.1908 г. у в. Скорычы каля Карэлічаў нар. Алесь Мілюць, беларускі паэт. Закончыў дзьве клясы пачатковай школы, самавук. Друкаваўся з 1928 г. у беларускіх часопісах у Польшчы. Загінуў 26.10.1944 г. на фронце ва Усходняй Прусіі.

90 – 11.10.1913 г. у Менску нар. Эдзі Агняцьвет (сапраўднае Каган), беларуская паэтка. Літаратурную дзейнасьць пачала ў 1929 г. Выдала зборнікі вершаў: „Вершы” (1938), „Вясновай раніцай” (1941), „Беларуская рабіна” (1959), „Жаданьне” (1971), „Закаханым” (1986), зборнікі вершаў для дзяцей: „Васількі” (1947), „На двары алімпіяда” (1984), „Рэчка-рэчанька мая” (1991). Перакладала на беларускую мову кнігі П.Ж. Бэранжэ, Г. Апалінэра, П. Элюара. Памерла ў 2002 г.

85 – 11.10.1918 г. Народны Сакратарыят БНР прыняў Часовую Канстытуцыю Беларускай Народнай Рэспублікі. Ператварыў Народны Сакратарыят у Раду Міністраў, старшынёй РМ і міністрам замежных спраў стаў Антон Луцкевіч.

85 – 18.10.1918 г. памёр Уладзімір Стукаліч, гісторык і краязнавец. Нар. у Якабштаце Курляндзкай губ. Гадаваўся ў Віцебску, дзе закончыў гімназію. У 1879-1883 гг. вучыўся на юрыдычным факультэце Пецярбургскага унівэрсытэту. Працаваў у казённых палатах у Слоніме, Гродне, Віцебску. У 1886 абараніў кандыдацкую дысэртацыю „Юрыдычнае становішча гарадзкіх абшчын у Заходняй Русі”. Працаваў адвакатам у Віцебску. Пісаў працы пра Аляксея Сапунова, Міколу Нікіфароўскага, выказваўся за адкрыцьцё унівэрсытэта ў Віцебску. Быў адным са стваральнікаў і членам Віцебскай вучонай архіўнай камісі.

80 – 28.10.1923 г. у Вільні выйшаў першы нумар газэты „Змаганьне” (выдавалася да сьнежня 1924 г.).

75 – 13.10.1928 г. пастановай ЦВК і СНК БССР Інстытут Беларускай Культуры ў Менску рэарганізаваны ў Акадэмію Навук Беларускай ССР (урачыстае адкрыцьцё адбылося 1.01.1929 г.).

70 – 25.10.1933 г. у Полацку нар. Нінэль Шчасная, жывапісец і графік. Закончыла Інстытут жывапісу, скульптуры і архітэктуры імя І. Рэпіна ў Ленінградзе (1961). Сярод яе твораў: карціны „Вясёлка”, „Васількі”, „Самотная”, „Налібоцкая пушча”, партрэты Максіма Танка, Аркадзя Куляшова, Рыгора Шырмы, Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, „Аўтапартэт”.

65 – 5.10.1938 г. памёр прафэсар Мар’ян Здзяхоўскі (нар. 30.04.1861 г. у Ракаве), літаратуразнавец.

65 – 10.10.1938 г. расстраляны Адам Бабарэка (нар. 14.10.1899 г. у в. Слабада-Кучынка каля Копыля), беларускі пісьменьнік і крытык. У 1927 г. закончыў Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт у Менску, працаваў выкладчыкам беларускай мовы і літаратуры ў Камуністычным унівэрсытэце Беларусі і ў БДУ. У 1930 г. рэпрэсіраваны, засуджаны на 5 гадоў высылкі. У 1937 г. арыштаваны паўторна. Друкаваўся з 1919 г., быў адным з арганізатараў літаратурных аб’яднаньняў „Маладняк” і „Узвышша”.

60 – 8.10.1943 г. у лагеры памёр Андрэй Мрый (сапраўднае Шашалевіч), беларускі пісьменьнік. Нар. у в. Палуж Краснапольскага раёна Магілёўскай вобласьці, закончыў духоўную сэмінарыю. Першы твор апублікаваў у 1924 г., аўтар сатыраў і апавяданьняў, м. інш. „Запіскі Самсона Самасуя” (1929). У 1934 г. арыштаваны і асуджаны на 5 гадоў папраўчых работ. У 1940 г. у Мурманску арыштаваны паўторна.

55 – 1.101948 г. у Менску ад-

крыўся Пэдагагічны інстытут замежных моў.

40 - 6.10.1963 г. пам. Віктар Чабатарэвіч – палітычны, вайсковы дзеяч (нар. у 1906 г. у Новым Сьвержані, Менскага павету). Скончыў настаўніцкую сэмінарыю ў Нясьвіжы. Да 1939 г. працаваў настаўнікам, за нацыянальную дзейнасьць сярод вучняў-Беларусаў быў перанесены на працу ў цэнтральную Польшчу. Падчас нямецкай акупацыі актыўна працаваў на нацыянальнай ніве. Пасьля вайны жыў у ЗША. Быў, між іншым, намесьнікам старшыні Беларускага Кангрэсавага Камітэту Амэрыкі.

30 – 31.10.1973 г. у Менску адкрыўся Палац мастацтваў – выставачны павільён выяўленчых мастацтваў.

15 – 19.10.1988 г. утвораны аргкамітэт Беларускага Народнага Фронту за перабудову „Адраджэньне"; утворана рэспубліканскае гісторыка-асьветнае таварыства памяці ахвяр сталінізму „Мартыралёг Беларусі".

15 – 30.10.1988 г. у Менску каля усходніх могілак і ў Курапатах адбыўся мітынг-рэквіем „Дзяды".

10 – У Бельску на Беласточчыне адбыўся I фэстываль "Бардаўская Восень" арганізаваны Зьвязам Беларускай Моладзі.

10 – 29.10.1993 г. пам. Сяргей Карніловіч – нацыянальны дзеяч (нар. 4.11.1929 г. у. в. Таргуны, Докшыцкага раёну). У 1944 г. вывезены на прымусовыя работы ў Нямеччыну. Вучыўся у Беларускай Гімназіі імя Янкі Купалы у Рэгенсбургу. У 1949 г. эміграваў у Кліўленд (ЗША). Актыўна дзейнічаў на нацыянальна-рэлігійнай ніве, між іншым 18 гадоў быў старшынёй Беларуска-Амэрыканскага Грамадзкага Цэнтру „Полацак".

Апрацавалі
Вячаслаў Харужы
і **Лена Глагоўская** ■

Папраўка

У папярэднім нумары памылкова былі пададзены даты нараджэньня і сьмерці Мар'яна Пецюкевіча. Нарадзіўся ён 24.09.1904 г., а памёр 13.09.1983 г. За памылкі перапрашаем. Аўтары ■

Пад саламянай страхой

У даўніну ў Беларусі на свята Пакровы (14-га па новаму, 1 кастрычніка па старому стылю) пяклі так званы «святы» пірог, які прыкладалі да страхі хаты, каб моцныя вятры яе не разбуралі. Наогул сяляне вельмі клапаціліся аб надзейнасці страхі. З гэтым былі звязаныя і розныя забабоны. Напрыклад, лічылі, што саломай ад збожжа, зжатага на дзень Барыса і Глеба (6 жніўня па новаму, 24 ліпеня па старому стылю), нельга крыць хату, бо тады страху знясе вецер ці спаліць маланка.

Ва ўяўленні нашых продкаў страха была верхняй мяжой унутранасці хаты, тым рубяжом, які аддзяляў сферу неба ад свету людзей, тым, што надзейна прыкрывала прастору жылля ад дзеяння небяспечных сіл знешняга свету. Наогул жа ў беларусаў былі асобыя адносіны да ідэі пакрытасці-непакрытасці: пакрытае, тое, што мае верхнюю мяжу, ацэньвалася як станоўчае, непакрытае – як адмоўнае. Таму, лічылі, усё ў хаце павінна быць пакрытым: і вёдры, і бочкі, і ўвесь посуд. Вядома ж, пакрытай павінна была быць і сама хата: пакрыў жыллё страхой – лічы, што дом гатовы.

Па павер'ях, пад страхой, на гарышчы часам пасяляецца хатні дух дамавік. На велікодным тыдні яго нават можна было пры пэўных умовах убачыць. Для гэтага, гаварылі, трэба ў Чысты чацвер у царкве на вячэрнім набажэнстве ўзяць свечку, запаленай прынесці яе дадому, з ёю падняцца на гару, і тады ўбачыш дамавіка, які ляжыць там у вобразе голага чалавека. Трэба пакрыць яго голае цела якой-небудзь кашуляй, і тады дамавік у знак падзякі выканае тваё запаветнае жаданне.

Расказвалі таксама, што на гарышчы жыве яшчэ адзін добры дух, які завецца Хут. Ён забяспечвае гаспадароў розным багаццем: золатам, збожжам і інш. Але каб Хут усё гэта прыносіў у дом, трэба яго смачна карміць. Асабліва любіць ён яечню, якую гаспадыня павінна аднесці на гарышча, паставіць там і крыкнуць: «Хут, Хут, ідзі сюды, дам яечаньку». Пад'еўшы, добры дух стараецца ўгадзіць гаспадарам. Але часам здараюцца тут і недарэчнасці. Напрыклад, расказвалі, што аднойчы парабак пачуў, як гаспадыня клікала Хута есці яечню, ды падумаў, што гэта яго клічуць ісці снедаць, і з'еў тую яечню, прызначаную для наднатуральнага жыхара гарышча. Хут вельмі раззлаваўся, падумаў, што гэта зроблена наўмысна, узяў і спаліў усю сядзібу. Збегліся суседзі, але так і не змаглі патушыць пажар. Калі ўжо ўсё згарэла, бачаць, сярод галавешак ляжыць нейкае старое кола. Адзін сусед узяў гэтае кола, маўляў, спатрэбіцца, і аднёс яго дадому. А гэта Хут абярнуўся ў старое кола. Дык ён таму гаспадару потым стаў усё прыносіць, так той і разбагацеў.

Са страхой і наднатуральнымі жыхарамі жылля, што туляцца ў прасторы пад ёю, на гарышчы, былі звязаныя і розныя абрады,

Фота Юркі Асенніка

якія праводзіліся сялянамі ў мінулым на пэўныя рэлігійныя святы. Так, напярэдадні Чыстага чацвярга на велікодным тыдні клалі пад страху хаты бохан хлеба, сальніцу з соллю і кавалак мыла. Лічылі, што пад уздзеяннем добрых духаў, якія жывуць на гарышчы, гэтыя рэчы павінны набыць чарадзейную сілу, таму потым іх выкарыстоўвалі ў пэўных рэгламентаваных народнай рытуальнай абраднасцю выпадках. Мылам назаўтра ж, у Чысты чацвер, мыліся ў лазні, лічачы, што гэта надасць здароўя на ўвесь год; хлеб хавалі, а потым выносілі на Юр'я з хаты, дзе ён суправаджаў першы выган жывёлы ў поле і павінен быў паспрыяць яе здароўю і засцерагчы ад драпежнікаў і ліхіх сіл; соль выкарыстоўвалі пры неабходнасці як сродак ад сурокаў.

Непасрэдна страха, салома, з якой тая зроблена, удзельнічалі ў некаторых рытуалах варажбы. Напрыклад, на Каляды ці на Шчодры вечар дзяўчаты зубамі выцягвалі саломінкі са страхі – чыя саломінка акажацца даўжэйшай, тая з дзяўчат хутчэй выйдзе замуж: у каго ж саломінка будзе мець колас з зернем, тая выйдзе за багатага, у каго без зерня – за беднага, калі ж саломніка наогул без коласа – ці то зусім застанецца ў дзеўках, ці выйдзе за ўдаўца. А вось на Фамін тыдзень (першы тыдзень пасля Вялікадня) варажылі па-іншаму: перакідвалі цераз страху пасхальнае яйка, і калі яно, упаўшы, разбівалася на кавалкі, лічылі, што ў гэтым годзе нехта ў доме памрэ.

Процілеглым страсе элементам канструкцыі жылля была падлога, якая з'яўлялася ніжняй мяжой прасторы жылога памяшкання. У народным усведамленні ў мінулым падлога збліжалася з урадлівай глебай. Таму з мэтай дасягнення багацця і шчасця ў хаце на Тройцу (Сёмуху) усю падлогу ў хаце густа засыпалі зялёным аерам. Гэтак жа і на Радаўніцу слалі на падлозе зялёную траву. Святасць падлогі, якая ўвасабляла ўрадлівую глебу, ніву, вызначалася і тым, што лічылася грахом пляваць на падлогу. Гаварылі, што ў гэтым выпадку з кожнага пляўка выводзіцца чорт.

Страха і падлога – два процілеглыя рубяжы чалавечага жылля, якія абмяжоўваюць яго зверху і знізу. Раней у беларускай вёсцы стрэхі амаль паўсюдна рабілі з саломы. Звычайна салому на страсе ўкладвалі разасланымі ці звязанымі снапочкамі. Вільчык – стык двух схілаў страхі – дадаткова ўмацоўвалі саломай, палівалі глінай і абціскалі спецыяльнай канструкцыяй з жэрдак (казламі). Добра зробленая саламяная страха магла праслужыць каля шасцідзесяці гадоў.

Падлога ў беларускай сялянскай хаце амаль да пачатку XX стагоддзя рабілася пераважна глінабітнай. (У даўніну не рэдкасць была і земляная падлога.) У XX жа стагоддзі распаўсюджваецца дашчаная падлога, якая, безумоўна, і цяплейшая, і больш гігіенічная. Сёння дашчаная падлога ў вясковых дамах робіцца паўсюдна, глінабітная і земляная падлога даўно адышла ў мінулае. Пайшлі ў мінулае і саламяныя стрэхі – цяпер у нашай вёсцы робяць дахі з гонты, шыферу ці з металічнага ліста. Але старая вясковая хата з саламянай страхой назаўсёды застанецца ў нашай памяці як успамін аб мінулым, аб жыцці-быцці нашых продкаў. Памятаеце, у Купалы:

З саламянай страхой
мая хатка, тачок!
Многа чутак наводзіць
і дум на душу.
Я ў сне бачу іх,
помню кожны разок
І ў сэрцы, як веру, нашу.

Якаў Ленсу

(Перадрук са „Звязды")

СБМ – міфы і факты

2. Дзякуючы прыхільнасці кіраўніцтва ЦДАКР сп. Нікіцін, як цвердзіць, выкарыстаў засакрэчаныя выхаваўчыя тэмы з мэтай скампраметаваць СБМ. Хай мне тады будзе дазволена назваць усе 20 сапраўдных сказаў прадбачаных рэгулямінам працы, што служылі ў самай справе фармаванню паставаў юнацтва, былі паўсюдна ў працы арганізацыі паўтараныя ў адпаведных момантах, як пры ўрачыстым падняцці сцягу ці важных занятках і г.д. Сказы гэтыя ў развіцці служылі якраз праўдзівымі тэмамі ўзгадаваўчага характару; вось яны дослоўна:

1. Ты не жыў зусім, калі жыў для сябе, ты не згінуў, калі памёр за Бацькаўшчыну.
2. Найвышэйшае шчасце і сэнс жыцця разумнай істоты палягаюць на барацьбе за свае ідэалы.
3. Найвышэйшы і найбольшы ідэал святы кожнаму народу – гэта ідэал яго вольнага жыцця.
4. Лёс чалавека – гэта ягоны характар, лёс народу – гэта воля і мужнасць ягоных мужоў і вернасць ягоных жонак.
5. Хто гнецца і стогне, той не варты быць вольным чалавекам.
6. Вялікае і вечна трывалае паўстае з няўтомнае працы і цяжкага змагання.
7. Тваё цела і твой дух належыць твайму народу.
8. Кожны твой крок і кожны твой чын павінны прыносіць гонар твайму народу.
9. Трус памірае сто разоў пакуль сканае, герой памірае толькі раз.
10. Лепш памерці стоячы, чымся жыць на каленях.
11. Ці ж можа быць больш пачэснае заданне, як з нічога тварыць вялікае паводле сваёй ідэі?
12. Я адзін – нічога, але мой Народ – усё, я смяротны, але мой Народ павінен жыць вечна.
14. Я з'яўляюся адной маленькай кропляй у вялікім няспынным патоку крывіцкіх пакаленняў і не дам перарвацца ягонаму імкліваму руху наперад.
15. Найвялікшы дар жыццё – дадзены нам не дзеля таго, каб мы марнавалі яго ў бяздзейнасці, але каб сваёй працай стварылі добрае, вялікае і прыгожае.
16. Гісторыя твайго народа павінна быць тваёй бібліяю.
17. Мова дадзена душы людзей.
18. Юнацкае слова – прысяга, юнацкае забавязанне – наш святы закон.
19. Вялікія справы паўстаюць із драбніцаў, заняпад пачынаецца ад гультайства і нядбайнасці.
20. Толькі той несмяротны, хто жыў для народа, толькі тое вечнае, што застаецца ў народзе. Жыве Беларусь!

(Працяг будзе)

Янка Жамойцін

Gdzie i ile mniejszości

Krzysztof Goss

Mimo iż od spisu powszechnego minął rok i trzy miesiące, w kwestii struktury narodowościowej wciąż prócz ogólnych liczb dotyczących poszczególnych województw, jakie trafiły do publicznej wiadomości na początku wakacji, nie można zapoznać się z bardziej szczegółowymi danymi. Dane z gmin i powiatów mają być opublikowane, jak podaje GUS, dopiero pod koniec roku.

Problem w tym, że dane opublikowane na stronach internetowych wojewódzkich urzędów statystycznych charakteryzują się różnym stopniem dokładności. Na niektórych zamieszczone są w miarę szczegółowe wykazy, jak ten z woj. kujawsko-pomorskiego, obejmujący 10 kategorii, jednak w większości prezentowana jest liczebność zaledwie kilku grup narodowościowych, a zdarza się, że oprócz dominującej – polskiej, tylko dwóch pozostałych najliczniejszych. Na stronie internetowej woj. łódzkiego przedstawiono jedynie odsetek Polaków i wymieniono z nazwy, bez podawania liczebności, najliczniejsze mniejszości narodowe.

W takiej sytuacji niemożliwe jest zarówno dokładne ustalenie struktury narodowościowej poszczególnych województw, jak też zbadanie rozmieszczenia na terenie kraju danej mniejszości, w tym także białoruskiej. Wiadomo jednak, iż 95 % tych,

Fot. Władysław Zawadzki

Dane z poszczególnych gmin mają być znane do końca roku

którzy w spisie określili swą narodowość jako białoruską, zamieszkuje woj. podlaskie. Tylko 2,3 tys. osób spośród tej mniejszości to mieszkańcy innych województw, nie będący ich ludnością rdzenną, a przybyłą tam bądź w ramach powojennej repatriacji z ZSRR, lub też w wyniku migracji wewnątrzkrajowych. Z powodu niedokładności statystyk w pewnych województwach liczebność Białorusinów żyjących w diasporze nie wszędzie została uwzględniona. Dane liczbowe podały województwa: mazowieckie, gdzie spisano ich największą, poza podlaskim, ilość – 0,8 tys., warmińsko-mazurskie – 0,3 tys., lubelskie – 0,2 tys., zachodniopomorskie – 0,1 tys., oraz kujawsko-pomorskie – 80 osób.

W sumie daje to około 1,5 tys. osób. W przypadku woj. dolnośląskiego stwierdzono natomiast, że wielkość mniejszości białoruskiej mieści się w przedziale od 100 do 600 osób, podobnie jak Rosjan, Greków, Żydów, Francuzów, Amerykanów, Włochów i Czechów. Gdzie znajdują się pozostałe skupiska i jak są liczne? – na razie nie wiadomo.

